# Дуель №61.

(апавяданні)

Гомель

vytoki.net

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/21 sprava A 88.

vytoki.net

# АРШЕЛЬ №61

Па дарозе пыліць аўтобус.
З-пад яго колаў,лямантуючы,разбягаюцца куры і качкі.Выбітае пер'е асядае разам з пылам.Прыкутае на ўзбочыне цялё дарэмна спрабуе уцякчы.Рэдкія старажытныя бабулькі няўцямна выглядваюць з-за платоў.Шукаючы выйсця безнадзейна скуголіць мясцовы Палкан.Раз-пораз з вакон пасажыркі выстрэльваюць пустымі пляшкамі "андропаўкі".Трашчыць шыфер,звіняць разбітыя шыбы.
Аўтобус выносіць у канец вёскі.
Насустрач павольна цягнецца лядашчая бабулька.Яна з цяжкасцю нясе вязку галля.
Дзіка завішчэлі тармазы...
Бы з рашчаўленай памідорыны ,з пасажыркі пырснулі патлатыя стварэнні.Бабулька спуджана прысела.Паасыпалася галлё.
-Позна,-падумала яна.
Некалькі істот схапіла яе за рукі,а да рота няўмольна набліжалася вялізная дуля мікрафону.Зашчоўкалі фатаапараты,зашасцела магнітафонная стужка.
- Гавары,-раўкнула ў дваццаць глотак.
Бабулька,перхаючы ад віннага перагару,збіваючыся,прамармытала некалькі фраз.
З-за хат данёсся гул.Адтуль вымкнуў натоўп



vytoki.net

раз'юшаных мужыкоў.Блішчэлі косы,ляскацелі цапы.Затрашчаў плот.

-Шуба!-заверашчала зграя.

Шалёна ўзравелі маторы.Аўтобус кракнуў ад напружання і знік.Бабулька,жагнаючыся,пяцілася ў крапіву.Першым падбег сусед Хвядос.

-Жывая,-ўзрадавана выдыхнуў ён.

-Паспелі...Цяпер ужо да наступнага лета не сунуцца.-У-у,-пагразіў ён пугаўём у бок шашы,-дыялектшчыкі...

* * *

АРЦЕЛЬ № 61

Пачынаўся цёплы сонечны ранак.Была вясна.

Студэнт Міхась Бульбаносаў зухавата саскочыў з ложка,схіліўшыся над гірай паспрабаваў падняць яе.Ён весела трулюлюкнуў некалькі разоў,потым перацісnуў шыю вафельным,у разводах,ручніком і паважна выйшаў з пакою.

Ва ўмывальні,адбіваючы пятамі кафельныя пліткі,ўжо разміналіся яго сябры.

-Плебеі !-прывітальна закрычаў Міхась.

У адказ папусцілі гаспадарчым мылам.Міхась спрытна ўхіліўся і,шлёпаючы па мутных калюжах рашуча іірвануў да бліжэйшага крана.

Вакол панаваў прыўзняты настрой.

Дзень Стыпендыі-заўсёды свята.

vytoki.net

Сцягнуўшы нядбала кінутую зубную шчотку і пасту, Міхась прыняўся зацята шмараваць зубы. У галаве гучэлі мужныя гімны залатадабытчыкаў Каландайка. Праз паўгадзіны на ганку Інтэрнату з'явіўся малады, чыста выгалены, прычасаны юнак. Ён пераможна акінуў наваколле.

-Плебеі,-падумаў ён, амаль уяўна адчуваючы ў кішэні цяжар сарака рублёў. Студэнцкая плынь падхапіла яго і панясла ў бок Інстытута.

Сёння яму гэта было нават прыемна.

"Купіць:,-думаў пра сябе Міхась,-шкарпэткі, насоўку, гальштук;

Заўтра дзень нараджэння ў Валечкі...

Колькі можна пазычаць...

Аддаць:,-зморшчыўся ён,-10 рэ--Натальцы, тры--Шурыку, руб дваццаць сем--Дзеду..."

У Дзеда ўжо як два тыдні ляжаў Міхасёў пашпарт...

Лагодныя думкі Бульбаносава былі перарваны палівальнай машынай, якая плюнула яму проста на летнік і ў твар.

-Плебеі,-абурыўся ён,-я ж ужо сёння мыўся.

Але і гэта не здолела спіхнуць яго з цвёрда абранага курсу. Паважнымі драмадэрамі* працягнуліся тры пары...

---

*ДРАМАДЭР(сапраўдн.бел.) --вярблюд



vytoki.net

-Міхаська!-закрычаў Навум,-ратуй!Ін'екцыя! Піватэрапія! З цябе куфаль піва і ты мой сябра навек.
А дванаццатай гадзіне ночы ў інтэрнатаускі пакой уваліласся брудная асоба Міхася Бульбаносава.З вялікімі намаганнямі ён узлез на свой ложак.З кішэні самотна выпаў паклычаны рубель,глуха дзынкнулі медзякі...
-Плебеі,-варухнуліся апухлыя вусны...

## АРЦЕЛЬ № 61

Сёння раніцой хлапцы паспелі зняць з уласных штрыпак ледзь цёплага Міхася Бульбаносава. Ён яшчэ дыхаў.Міхася ўсклалі на ложак і сябры схіліліся над ім у чаканні адказу.
-Усё роўна мне не жыць,-прасіпеў Міхась і мутная слязіна закацілася прама ў вуха.
-Хто? -Машка,-прастагнала ахвяра.
Бы жорны ў млыне скрыгатнула пяць скіўіц. Хударлявы юнак,што стаяў ля Міхасёвых ног упаў на дол і зашкроб падлогу брудным і пазногцямі.Яго хутка паднялі і супакоілі.
Траякі пасыпаліся на клышаногі стол.Нават у Міхася вытраслі сорак сем капеек,які усё яшчэ вяртаўся з нябыту.У краму паслалі хударлявага.Астатнія паселі на Раду.

vytoki.net

Летась з-за Машкі ў прыпадку рэўнасці Віцёк разбіў дванаццаць вялізных шыб,-біў рукамі. Яго падабрала "Хуткая".

Слаўка,крыху пазней,прабіраўся да Машкі ў пакой па вадасцёкавай трубе.На ўзроўні трэцяга паверха яна адвалілася ад мура.У Інстытут ён прыйшоў праз два з паловай месяцы.

Трэйці з пакоя,што сядзеў на перакуленым зэдлі,падпіраў голаў дрыжачымі рукамі.На жылах ружавелі свежыя шнары.

Калі вярнуўся хударлявы,усё было ўжо вырашана;

Трымя пляшкамі "андропаукі"сябры замацавалі змрочны план помсты.

Наступным вечарам у мужчынскай прыбіральні можна было назіраць незвычайнае відовішча.

Перагнуўшыся ў поясе стаяла Машка.У роце яе тырчэла шкарпэтка Міхася Бульбаносава. З вышчанага азадка былі спушчаны джынсы "МАНТАНА"і нейчы, сорак пятага памеру,кед, пераходзячы з рук у рукі,гучна ляскацеў па ягадзіцах. Усе трымаліся мужна.

Ніхто не адступіў.

§§§§§§§§

## ПАДАРУНАК

А.Каналёў.

Малады паэт Міхась Бульбаносау,зборнік вершаўякога толькі што выйшаў з друку,неўзабаве атрымаў ад прыхільніка свайго таленту падарунак - бутэльку выдатна вытрыманага каньяку.

vytoki.net

Праз некалькі дзён да прыхільніка прыйшоў ліст наступнага зместу:

Паважаны сябар!

Вельмі ўдзячны Вам за Ваш падарунак.Атрымаўшы яго,я адразу ж сеў за машынку,каб выказаць Вам сваю ўдзячнасць.І вось зараз я пішу гэтыя радкі і адначасова глыток за глытком з вялікай асалодай пацягваю гэты выдатнейшы напітак.Павінен сказаць,што такога каньяку я яшчэ ніколі не піў.Гэта сапраўдны напітак багоў,і чым болей ад яго адпіваеш,тым бооолей ён ап'п'яняе. Вы не ожацеса бе ўяу іць,якую калысссальную радастць даскав іліі. Дык даз вольжа МІІлы дружа фыв ролджыць блаадарнасц цго гаў іцітл галбу бўцІл %%+++;чэння у хут ??...мёмёмёмё І/4 І 5 ббббб!!ъ "

І98Ігод

Горад ГОМЕЛЬ.



vytoki.net

vytoki.net

НАКЛАД: 2 экз.

Кошт: 10 кап.

vytoki.net